**ПЕРАВАРО́ЧВАННЕ**, сімвалічныя дзеянні, якім прыпісвалася магічная сіла мяняць на адваротнае развіццё падзеі і ліхія прадказанні. Калі, напрыклад, помнік па нябожчыку быў пастаўлены перад *засухаю*, то прычыну яе ўзнікнення бачылі менавіта ў гэтым, — таму помнік пераварочвалі (каб засуха перавярнулася на дождж), пакуль зямлю зноў як след не прамочыць. Каб вывесці асот з поля, вырывалі адно яго каліва і, асвяціўшы, зноў закопвалі, перавярнуўшы коранем уверх. П. — гэта ўяўны спосаб навядзення парадку ў парушаных справах. Напрыклад, калі дзіця ўдзень спала, а ўночы гуляла, то каб прывесці яго да ладу, пераварочвалі каўняром уніз яго кашульку. Хворае дзіця пераварочвалі ў калысцы, надзявалі кашулю рукавамі на ножкі, удзень завешвалі вокны, а ўночы асвятлялі хату. Каб прайшла немач, хворага на радзімец ставілі ўніз галавою. Разам з тым П. — гэта і парушэнне натуральнага ходу падзей, заведзенага парадку, яно можа мець зусім непажаданы вынік. Калі нехта надумаецца ссыпаць зерне ў вывернуты мех, гэта можа прывесці да паввароту на горшае (зерне можа звесціся); калі паслаць абрус навыварат, ад таго дому людзі могуць адвярнуцца; ад пасланай навыварат пасцелі і навалакі можа паявіцца бяссонне. З гэтай жа прычыны забаранялася хадзіць задам наперад пад пагрозаю смерці бацькі ці маці; не дапускалася выносіць нябожчыка галавою наперад, бо ўсе ў хаце перамруць. П., як лічылі, можа адагнаць ліхое прадказанне: калі сабака вые, варожачы на смерць, раілі пераварочваць посуд у доме (тады і ліха перавернецца на дабро); каб не спраўдзіўся нядобры сон, пераварочвалі бялізну, пасцель, накрыўку аж да новага сну. П. вельмі часта выкарыстоўвалася ад сурокаў, дзеля чаго надзявалі панчохі, адзенне і шапку навыварат. З апатрапеічнай мэтаю часта браўся вывернуты кажух: з ім сустракалі на парозе дома дзіця пасля хрышчэння; яго сцялілі пад дзяжу ў час пасаду; з ім праводзілі пад вянец і сустракалі з-пад вянца маладых. Часам у перавернутай адзежы хадзілі ў лес, каб не заблудзіць і не трапіць да *Лесуна*. Паводле нар. перакананняў, *Вадзянікі* пасля асвячэння вады на Вадохрышча ўцякаюць з вадаёмаў і прыходзяць у вёску па вазкі і сані, каб вывезці сваіх дзяцей, таму сяляне ў гэты дзень лічылі за лепшае перавярнуць свой транспарт. Ад наведвання нябожчыкаў перастаўлялі ў возе аглоблі і, перавярнуўшы вось, мянялі правае і левае кола; або, раскапаўшы магілу чарадзея, пераварочвалі яго труп, каб больш не прыходзіў у вёску. Супраць шкодніцтва жывых чараўнікоў «пераварочвалі» мянушкі ў кароў, у выніку чаго, верылася, што малочная ведзьма атрымае малако ці мачу інш. жывёл; або запальвалі свечку, пераварочвалі яе, скручвалі і запальвалі з другога канца, і калі яна згарыць — гэтак жа скруціцца і загіне ліхадзей.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 644.

*У. А. Васілевіч.*